**Таямніцы Белавежскай пушчы**

*(Матэрыял да правядзення гадзіны цікавых паведамленняў)*

**Белавежская пушча... Дзівосны па хараству куток роднай прыроды, дзе так многа бясконца таямнічага, дзе багаты і ні з чым непараўнальны раслінны і жывёльны свет.**

Сёння ўвесь свет ведае аб велічных, амаль першародных лясах нашай Белавежскай пушчы.

А што ведаем аб ёй мы? *(Звярнуцца да прысутных, заслухаць некалькі адказаў).*

А цяпер давайце глыбей зазірнем у таямніцы запаведнага пушчанскага лесу.

Белавежская пушча – самы стары запаведнік у свеце. Яна ахоўваецца і лічыцца запаведным дзяржаўным лесам з Х1У стагоддзя, калі князь Ягайла аб'явіў яе запаведнай, пакінуўшы правы палявання за сабой і сваім братам Вітальдам.

У залежнасці ад формы аховы Белавежская пушча мела розныя назвы – заказнік, запаведнік, запаведна-паляўнічая гаспадарка. З верасня 1991 года яна стала першым у нашай краіне нацыянальным паркам.

Мяняліся межы пушчы, мяняліся яе гаспадары, але ва ўсе стагоддзі яна заставалася ахоўваемай вялікакняжаскай або царскай уласнасцю і недзялімым лясным масівам.

У летапісе Белавежскай пушчы захаваліся дні царскага палявання 6 і 7 кастрычніка 1860 года з удзелам чатырох замежных прынцаў і аднаго герцага. Да візіту цара рыхтаваліся старанна. Рамантавалі дарогі, ладзілі гаці, наводзілі масты. У першы дзень імператар Аляксандр 11 асабіста застрэліў семнаццаць жывёл, у тым ліку чатырох зуброў. Імкнуліся паказаць свой спрыт перад гаспадаром і госці. У выніку за 2 дні было знішчана 28 зуброў і 68 іншых жывёл.

У гонар гэтай бойні Аляксандр 11 загадаў паставіць помнік. Праз 2 гады быў адліты чыгунны зубр у натуральную велічыню на заводзе ў Пецярбургу і ўстаноўлены ў пасёлку Белавежа.

З часу знакамітага палявання Аляксандра 11 правядзенне падобных мерапрыемстваў стала ў Белавежскай пушчы традыцыйным. У 1888 годзе пушча была передадзена ва ўласнасць царскай сям'і. А ў 1889 годзе па рашэнню цара пачаў будавацца паляўнічы палац у цэнтры Белавежскай пушчы – пасёлку Белавежа. Будаўніцтва ішло 5 гадоў. У выніку палац стаў сапраўдным творам архітэктурнага мастацтва.

Усе 10 парод белавежскага лесу былі выкарыстаны ў будаўніцтве. Будаўнікі справіліся з пастаўленай задачай – аздобіць палац дрэвам простых парод, каб гэта быў цуд мастацтва.

Белавежскія лясы спакон веку былі месцам незлічоных бітваў, высечак і жорсткіх паляванняў з вынішчэннем усяго жывога.

У час паўстання 1863 года колькасць зубраў у пушчы скарацілася на 377 адзінак, забівалі жывёл і войскі, і паўстанцы.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

У жніўні 1915 года на тэрыторыю пушчы пранікла германская армія. Газеты таго часу паведамлялі, што зубры, не вытрымаўшы націску і жорсткасці людзей, кінуліся на атрад, падмінаючы пад сябе салдат. У адказ быў прыменены растрэл зуброў з кулямёта.

У 1920 годзе ў пушчы з вялікага статка застаўся толькі адзін зубр, у 1921 годзе застрэлены і апошні. І толькі ў 1929 годзе у пушчу былі завезены некалькі зуброў з заапаркаў Еўропы. З іх пачалося ўзнаўленне віду. У 1941 годзе (да пачатку авйны) у пушчы налічвалася ўжо 19 зуброў.

У час першай сусветнай вайны, калі пушча належыла Расіі, яна падвяргалася яшчэ і беспрыкладнай па жорсткасці вырубцы лясоў. За два з паловай гады Ў Германію было вывезена 4,5 млн. куб. м. драўніны, прычым, самых каштоўных парод. Гэта амальстолькі, колькі вырублена ў пушчы за ўсю папярэднюю гісторыю.

У 1919 годзе пушча перайшла ва ўласнасць Польшчы, але рубкі лесу працягваліся. У 20-я  гады пушчу вырубалі англічане.

У 1939 годзе тэрыторыя пушчы ў 129 тыс. га адышла БССР. У 1940 годзе адпаведна з асобнай пастановай уся тэрыторыя пушчы павінна была стаць запаведнай. Але пачалася вайна, і зноў паўтарылася былая гісторыя. 22 чэрвеня 1941 года – дата, якая лягла на пушчу ценем і стала вялікай чалавечай трагедыяй. Да гэтага часу вялікі лес хавае магілы вывезеных сюды і расстраляных жыхароў.

У час вызвалення пушчы ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў ў выніку ваенных дзеянняў у ноч на 16 ліпеня 1944 года загарэўся і моцна пацярпеў імператарскі паляўнічы палац. Да таго ж “дапамаглі” мясцовыя марадзёры, расцягнулі найбольш каштоўнае.

Па дагавору 1945 года аб дзяржаўнай мяжы паміж Польшчай і СССР заходняя частка пушчы разам з пасёлкам Белавежа адышлі Польшчы. Доўгі час ішлі спрэчкі – што рабіць з палацам. Вырашылі ўзарваць. Аказалася, што зрабіць гэта няпроста. Дынаміт з цяжкасцю разбураў будынак, настолькі ён быў моцны.

На думку спецыялістаў, стварыць архітэктурны твор, падобны імператарскаму палацу, наўрад ці каму ўдасца.

Пасля вайны ў кастрычніку 1944 года дзейнасць запаведніка была ўзноўлена. Пушча засталася, нягледзячы на варварскія адносіны да яе з боку чалавека.

Белавежская пушча мае велізарную прыцягальную сілу. Не менш, чым палітычных дзеячоў, прыцягвала яна ў розныя часы мастакоў і пісьменнікаў. Магчыма, тут нарадзілася ідэя ў вялікага рускага мастака Шышкіна напісаць карціну “Карабельная роща”. У 1892 годзе вясной і летам ён быў у Белавежскай пушчы і выканаў некалькі эцюдаў з натуры: “В Беловежской пуще”, “Срубленный дуб”, “Сухостой”, “Бурелом”, “Пасекол”.

Даволі цікава адзначыць яшчэ адзін факт, які прынёс пушчы вялікую папулярнасць. Калісьці тут хацеў пасяліцца вядомы французскі філосаф Жан Жак Русо. І здзейсніўся б план перасялення, каб не дрэнны  ўчынак аднаго прадзісвета, які падмануў вялікага філосафа. Выдурыўшы вялікую суму

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

грошай, ён знік. Пакрыўдзіўшыся на ўвесь белы свет, Русо выбраў для адасаблення прыгарад Парыжа.

Шмат іншых цікавых гісторый адбывалася ў жыцці пушчы. Усе яны па-свойму цікавыя і адметныя. Пушча захоўвае мноства малых і вялікіх таямніцаў, большасць неразгаданых чалавекам.

Кажуць, ёсць у пушчанскім лесе старажытны камень, пра які ходзіць легенда, што на ім пакінуты сляды Божай Маці.

Непадалёк стаіць унікальны 500-гадовы дуб-велікан. Скрозь дупло гэтага дрэва, па паданнях, праносілі хворых людзей, і тыя папраўляліся. Унутры дупла могуць проста змясціцца чатыры чалавекі. Цяжка сказаць, легенда гэта ці праўда.

А вось чыстая праўда тое, што паветра ў Белавежскай пушчы чысцей, чым у аперацыйнай. Неяк спецыялісты замералі, колькі патагенных мікробаў знаходзіцца ў кубаметры пушчанскага паветра. Аказалася, у паўтары разы менш, чым у аперацыйнай палаце пасля стэрылізацыі.

А як вы думаеце, чаму ў Белавежскай пушчы так добра адчуваюць сябе і расліны, і жывёлы, і чалавек? Аказваецца, пушча – адно з нямногіх месцаў на Еўрапейскім кантыненце, якія вучоныя называюць “месцамі сілы”. У такіх месцах, як нідзе болей, супакойваюцца думкі і эмоцыі, абуджаюцца добрыя пачуцці і намеры, адчуваецца прыліў энергіі, адбываецца аздараўленне арганізма.

Па тэрыторыі Белавежскай пушчы праходзіць так званы геалагічны разлом, уздоўж якога пралягае адна з ліній выпраменьвання станоўчай энергіі. Зусім верагодна, што каралі, цары і іншыя высокапастаўленыя асобы ведалі аб высокім праяўленні станоўчай энергіі на тэрыторыі пушчы. Ці не таму яны і выбіралі яе месцам адпачынку і ўзнаўлення сіл?

Цікава ведаць і тое, што па ўсёй пушчы, асабліва ўздоўж рэк, можна знайсці сляды пражывання чалавека мінулых стагоддзяў. Камяні і валуны азначаюць месцы правядзення язычніцкіх абрадаў.

Шмат цікавых з’яў і таямніц у раслінным і жывёльным свеце пушчы. У многіх месцах пушчы сустракаюцца дрэвы, якія зросліся. Для батанікаў гэта справа вельмі складаная, а прырода творыць цуды – аб’ядноўвае ў адно цэлае дрэвы зусім розных відаў, парод і класаў. Прырода папрацавала тут не горш за Мічурына.

А вось нядаўна вучоныя-батанікі ў відным для ўсіх месцы знайшлі рэдкую расліну – папаратнік-страўсалер, лісты якога напамінаюць пышнае пер’е страуса.

А ці ж не загадка для вучоных самая буйная жывёліна Еўропы – зубр, сучаснік старажытнага маманта. Усе маманты даўно вымерлі і сталі легендай. Зубр жа працягвае жыць і добра сябе адчувае, асабліва ў вольных пушчанскіх лясных прасторах.

Белавежская пушча сёння – гэта ўнікальны куток роднай прыроды, размешчаны на тэрыторыі Пружанскага, Камянецкага, Свіслацкага раёнаў. Плошча нацыянальнага парку складае 87,6 тыс. га. Тут расце звыш 900 відаў вышэйшых раслін, 250 відаў мохападобных і лішайнікаў; 40 відаў рэдкіх

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

раслін Белавежскай пушчы занесены ў Чырвоную кнігу – скальны дуб, піхта белая, плюшч звычайны, герань цёмная, прыгажуня архідэя, лілея “царскія кудры” і іншыя.

Самыя багатыя па складу флоры лясы знаходзяцца ў ваколіцах вёсачкі Хвойнікі. Усё тут шэпча, звініць і пераліваецца, маўкліва паглядаюць на мітусню ў лесе старыя елкі. Але асаблівае захапленне выклікаюць белавежскія сосны, сярод якіх ёсць асобныя экземпляры, што налічваюць па 400-500 гадоў. Іншыя зачароўваюць сваёй вышынёй больш за 40 метраў. Менавіта такія дрэвы прыцягвалі ўвагу майстроў карабельных спраў у мінулых стагоддзях.

Белавежскія сосны зрабілі славу многім флатам заходніх краін – асабліва Англіі і Францыі. Лепшыя замкі Еўропы таксама былі аздоблены пушчанскім дрэвам.

Можна бясконца гаварыць і пра адмысловы жывёльны свет сучаснай пушчы. Тут 59 відаў млекакормячых, 227 відаў птушак, каля 8500 відаў насякомых, у вадаёмах пушчы 27 відаў рыб.

Сярод рэдкіх жывёл і птушак, занесеных у Чырвоную кнігу, - арлан-белахвост, беркут, малы падорлік, белая чапля, лебедзь-шыпун.

Водзіцца ў лясах пушчы і рысь, і куніца, і выдра, і норка, і бабёр. Пералічыць усе скарбы Белавежскай пушчы немагчыма. Жывёльны свет пушчы – гэта свет таямніц, цалкам нявывучаны і непазнаны.

Казадой у пушчанскім лесе моцна крычыць сваё “люблю”, дудзіць удод, свішчуць івалгі. А вось салаўі, як лічаць усе арнітолагі свету, па колькасці каленцаў у пушчы самыя лепшыя. У адрозненні ад белага брата хаваецца ад людзей чорны бусел. Лунаюць над паплавамі і балотамі ястрабы, чырвоныя каршуны, беркуты, скачуць жоравы, лётаюць вясёлкавыя фазаны. І зязюля лічыць бясконцыя гады ўсім, хто прыйшоў сюды з дабром.

Але галоўная фігура жывёльнага свету пушчы – зубр, старажытны жыхар планеты. Белавежская пушча стала яго апошнім прыстанішчам. Старажытны лес прытуліў даўніх сваіх жыхароў, абараніў, даў ім магчымасць размнажацца.

Наша Белавежская пушча самая тытулаваная: мае міжнародны статус біясфернага заказніка, з’яўляецца еўрапейскім дыпламатам, уключана ў спіс сусветнай культурнай і народнай спадчыны. Ні адзін аналагічны прыродны аб’ект у Еўропе не мае нічога падобнага. Не нарадзіўся яшчэ на зямлі чалавек, які мог бы вырасціць падобны лес. Словы “унікальны”, “дзіўны”, “самы” можна прымяніць да кожнага кутка пушчы. На пушчу трэба глядзець вачамі першаадкрывацеля, тады яна становіцца перад вамі па-сапраўднаму цудоўнай і бясцэннай як народны аб’ект, як месца з багатай гісторыяй.

Зрабіўшы сёння экскурс у гісторыю, можна паўтарыць словы песні: “Нам понятна твоя вековая печаль, Беловежская пуща».

Пад кронамі соснаў, векавых дубоў тут абмяркоўвалася і прымалася не адно палітычнае рашэнне, а 9 снежня 1991 года ва ўрадавай рэзідэнцыі Віскулі быў падпісаны дагавор аб скасаванні Савецкага Саюза.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Галоўнае для пушчы сёння – пазбегнуць “дзікіх паляванняў”, якія здараліся ў мінулым. Першы нацыянальны парк павінен мець нацыянальную годнасць – захаванасць унікальнай флоры і фауны.

Давайце пільна ўслухаемся ў гоман пушчы: яна ніколі не маўчыць. Тут чуецца бясконцае апавяданне на дзіўнай, незразумелай нам мове, ніколі не моўкне Белавежская пушча. Ніякія кнігі і карціны не дадуць поўнага малюнка непаўторнай прыгажосці пушчы.

Давайце услухаемся, душой і сэрцам адчуем загадкавую сілу Белавежскай пушчы – аднаго з найпрыгажэйшых сімвалаў нашай Радзімы.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ